# ЭКАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕРАСЦЕЙСКАЙ ПАЭЗІІ

Н.М. Борсук

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С.Пушкіна
г. Брэст, Беларусь

*The works of contemporary Brest poets are full of concern about the future of the nature. They believe that the future of the nature depends greatly on* ***man 's*** *future. At the same time the nature influences people 's characters and mood. This problem is illustrated in the analysis of the poems by A. Kasko, Z. Dudzyuk, M. Prakapovich, M. Papeka...*

За лесам - лес, за грудам - груд,
а ўсё замала нам, каб верыць,
што некалі прырода суд
з усёй суровасцю завершыць.
А.Каско

Паэтычная творчасць нашых сучаснікаў успрымаецца як своеасаблівае папярэджанне чалавецтву, што працэс хаосу, разбурэння па віне чалавека ўварваўся ўжо ў зямное жыццё. Кожны з нас “часцінка зямлі”, - нагадвае А.Каско ў вершы “Еднасць”. Таму і заклікае паэт імкнуцца да гарманічных узаемаадносін паміж чалавекам і прыродай. Для А.Каско важна, каб кожнаму з нас балела душа, калі ён заўважае, як “нішчацца дрэвы, высыхаюць крыніцы”. Параўнанні, што выкарастоўвае паэт у дадзеным вершы (“Гэта мой / востры боль / крыкам жаласным кані / прылятае так часта / да сяліб / з сенажацей”; “асцярожна трымае / на далонях дзяўчынка, / як маленькае сонца,- / спелы яблык чырвоны”), раскрываюць душэўны стан чалавека, які неабыякава ставіцца да грамадскіх праблем: “Мой дакорлівы позірк / вы сустрэнеце ў лесе / ў “вочках” белай бярозы: / апусціце / сякеру!..”

Дзяцінства, юнацтва А.Каско прайшло ў маляўнічых мясцінах (в. Чудзін). Паэт, як сведчыць яго творчасць, здолеў глыбока ўспрыняць унікальнае багацце прыроды. Яго душа пакутуе ад экалагічных зрухаў, што адбываюцца ў краі. Думаецца, таму А.Каско параўноўвае боль змялелай рэчкі, якая па кроплі аддае сябе засушанай глебе; лёс яблынькі, што абараняе танюсенькія маладыя пасынкі, каб яны не сталі здабычаю варання з мукамі і перажываннямі вагітнай: “О, як жа трывала ты мукі свае / і як твае рукі цягнуліся ў неба! / Мо гэтак па кроплі сябе аддае / змялелая рэчка засушанай глебе”. Паэт звяртае ўвагу, што пакуты неабароненай прыроды падобныя да пакут цяжарнай жанчыны. Такім чынам, у вершы “О, як жа трывала ты мукі свае!..” пераплятаюцца дзве жыццёва важныя тэмы. Без жанчыны жыццё не мае паступальнасці, будучыні, але, калі знікне жыццё на Зямлі, усё ўвогуле траціць свой сэнс, не будзе мець месца. Гэтая думка яскрава прасочваецца ў апошніх радках верша. Крыкам немаўля абвяшчае паэт на ўвесь свет, “што ёсць адзіная воля ў любві і ў прыродзе!”

Трывогай за мір, за будучыню нацыі, дзяржавы прасякнуты вершы З.Дудзюк “Прымула Імерыаліс”, “ЧДУ”, “Забітая зямля”, “Чарнобыльская балада”... Героі гэтых вершаў адчуваюць сябе не толькі нашчадкамі, але і пачынальнікамі ўсяго будучага жыцця, дабра і зла, праўдзівага і лжывага, прыгожага і пачварнага... Калі ў вершы “Пустэльнае воблака” чытач жыве прадчуваннямі, што трагічныя страты на шляху гісторыі непазбежныя, то ў вершах “Забітая зямля”, “Спелая восень стамілася ў доўгіх турботах...”, “Чарнобыльская балада” паэтэса паказвае, як чарнобыльскае гора азмрочыла край. За тры гады да аварыі ў душы З.Дудзюк жыла кволая надзея, што “... свет не ўзарвецца. / Мы яго збераўжом, / вечным мірам надзелім. / Нават зоркі на нас / пазіраюць з надзеяй”.

На жаль, надзеі паэткі не спраўдзіліся. Для З.Дудзюк і яе гераіні помніць - значыць бачыць наперад. Па гэтай прычыне, думаецца, паэтка выводзіць у вершах на экалагічную тэму вобразы чыноўнікаў, якія прыкрываюцца часова дапушчальным узроўнем радыяцыі і не задумваюцца, што экалагічная сітуацыя, якая склалася ў краіне, пагражае "часовасцю" народу, нацыі: "Бяздумна, не са зла, а з раўнадушша / Забіў зямлю чыноўны чалавек. / Забіў, як забіваюць часам душы - / Няўжо не адрадзіцца ёй навек?" Ці не па гэтай прычыне верш "Забітая зямля" насычаны пытаннямі: "Як паглядзець у твар свайму народу, / Калі прынёс бяду яму і боль"; "Як на шляху да шчасця ды багацця / Нам бараніцца ад саміх сябе?" "Мілыя чалавекі" - такую трапную характарыстыку дае чыноўнікам, якія "краяць Палессе з такім запалам, / што пыл курыцца над колішняй багнай" М.Пракаповіч у паэме "Прыходзіў час". Гераіня З.Дудзюк мудрая, яна не зняверваецца як і герой М.Пракаповіча. Аб'ектам іх клопату становіцца не канкрэтнае зло, якое патрабуе поўнага і неадкладнага выкрыцця, а спрадвечная недасканаласць чалавечага быцця: "А можа, ўсё проста: / дзверы - насцеж, вокны - насцеж, / і скразняком адказнасці / прэч з кабінетаў - у канал калідора / застаялы дух / абыякавасці...".

Вяшчункай экалагічнай бяды ў паэзіі З.Дудзюк прадстае зязюля.Птушка першай адчула, што без палескай нерушы не будзе і жыцця. Праз яе пакуты паэтэса паказвае, што бяздушнае і бяздумнае панаванне чалавека над прыродай - не самае лепшае дасягненне цывілізацыі, бо вынікам пакарэння становіцца пакаранне невінаватых. Няўтульна, часам безнадзейна пачуваюць сябе прадстаўнікі жывёльнага свету ў сучасным паслячарнобыльскім экалагічным свеце. Трагічна, але так падобна да праўды гучыць прызнанне М.Пракаповіча ў вершы "Як сон, скавала крылы стома": "Буслы вяртаюцца дадому, / а там - мароз, а там - зіма, - / насуперак усім прагнозам... / ... / ... Стаяць буслы і камянеюць / з нямым здзіўленнем у вачах". На жаль, у нас да чарнобыльскай трагедыі драма прыроды не ўспрымалася як экалагічная бяда. "Вельмі прыемна, - звяртаў увагу сваіх студэнтаў У.Калеснік, - што палеская кагорта (М.Рудкоўскі, М.Пракаповіч, Я.Янішчыц, З.Дудзюк) задаўна да народнай бяды кінуліся на выручку Палесся, у той час як другія марылі толькі пра панаванне над прыродай".

Перадаць боль, трывогу і заклапочанасць сучасным станам экалогіі, спусташэннем і выміраннем жывой прыроды ("Сустрэча ў лесе" М.Рудкоўскага, "Прыходзіў час" М.Пракаповіча), паглыбіць роздум аб змястоўнасці і гарманічнасці жыцця продкаў ("Вогнішча" М.Рудкоўскага) дапамагае паэтам зварот да міфалагічных матываў.

У вершы "Вогнішча" М.Рудкоўскі звяртаецца да вобразу бога Сварога. Праз узаемапаразуменне, што наладзілася паміж лірычным героем М.Рудкоўскага, "аматарам паходаў грыбных", і богам Сусвету, паэт сцвярджае цесную сувязь чалавека з жывым светам прыроды, з народам, Радзімай. Гэта невыпадкова, бо з імем бога Рода (другое імя бога Сварога), сцвярджае пісьменнік і гісторык У.Арлоў (гл. "Пад уладаю Перуна і Сварога" / З гісторыяй на "Вы". Публіцыстычныя артыкулы. Выпуск другі. Мн., 1994), звязана ў нашай мове мноства важнейшых слоў і паняццяў: народ, радзіма, родзіч, продак, радавод, нараджэнне, прырода, ураджай, адраджэнне...

Матывам трывожнага чакання, прадчуваннем катастрофы прасякнуты верш М.Рудкоўскага "Сустрэча ў лесе", які населены незвычайнымі героямі. Былога ахоўніка цішыні азёр і крыніц, валадара лесу ахоплівае сум. "Праганяюць лесуноў з лясоў, / З тоняў, з трыснягоў - вадзянікоў / і русалкам не даюць прапіскі / ў палавеі жыта за сялом". Як крык аб паратунку гучаць праніклівыя словы паэта пра запусценне лясоў, несалодкі лёс рэк: "І становіцца масівам бор, / вадаёмам - глыбіня азёр". Праз думкі міфалагічных істот М.Рудкоўскі нагадвае пра сучасны стан беларускай прыроды. Паэта непакояць адносіны чалавека да вырашэння экалагічных праблем.

М.Пракаповіч надзяляе не толькі душой, але і свядомасцю міфалагічныя істоты (паэма "Прыходзіў час..."). Назіраючы за людзьмі, якія выйшлі з "нематы", але, на жаль, трапілі "ў бязвер'е", ні заімшэлы вадзянік, ні меч-трава не спадзяюцца больш на

літасцівую волю і розум чалавека. Міфалагічных герояў гэтага паэта нават ахоплівае пачуццё пагарды, калі яны бачаць, як людзі падобна кратам "капаюць, капаюць сабе капцы,- / ні неба, ні сонца не бачаць, сляпцы!". Барацьбу за чалавечые душы распачынае вадзянік і меч-трава на старонках кнігі М.Пракаповіча "Мяжа надзеі": "Я ў Чырвоную кнігу / занесці прашу / першай - / Чалавечую Душу". Такім чынам, праз вобразы міфалагічных істот сучасныя паэты ахоўваюць некранутасць прыроды, засцерагаюць ад неразумных дзеянняў у ёй чалавека, а таксама вядуць барацьбу супраць спусташэння людскіх душ.

Трывогаю за лёс чалавецтва прасякнуты шосты раздзел паэтычнага зборніка пейзажнай лірыкі "З прыродай зліўшыся душой". У главу "Трывожныя позвы" складальнікі (Лебедзеў У., Праневіч Г., Сенькавец У.) ўключылі і вершы берасцейскіх мастакоў слова. Пры адборы паэтычных твораў яны кіраваліся думкаю, што клопат пра фізічнае і духоўнае здароўе нацыі немажліва ўяўвіць без уважлівага, беражлівага стаўлення да прыроды.

Перачытваем верш М.Папекі "Балада аб ласіным балоце", які ўключаны ў вышэй названы зборнік, і не пакідае думка, што чалавек - горкі прыстасаванец. Ён з лёгкасцю пераломвае сябе, калі дзеля кавалка мяса, дзеля задавальнення імпэту паляўнічага забівае ласіху з двума не народжанымі ласянатамі. Без жалю скідвае скуру ў багно. З горкай іроніяй гучаць апошнія радкі верша: "Людзі першабытнай культуры / "робяць ногі" / ў XXI стагодзьдзе..." Дзіўна, што ходзіць герой верша М.Папекі яшчэ на дзвюх нагах, а не поўзае, як звер, на чатырох.

А дрэва - яно зусім іншае... У адрозненне ад чалавека не здрадзіць. Расце на зямлі, служыць людзям. Дуб (верш М.Купрэева "Маналог дуба") "дужай галінаю з неба / маланку зрываў / і ўганяў у зямлю - / каб гэтае вогненнае кап'ё / здуру не трапіла / у хутар Ганны - салдаткі-ўдавы". Дзеці гаспадыні - Ванечка і Алёнка - любілі пад веццем дуба збіраць жалуды. Аднойчы прыехаў гаспадар і адрэзаў бензапілою ніжні сук дрэва - "здаровы і самы багаты на жалуды". Гэтыя паводзіны чалавека дуб успрыняў балюча, але ж без крыўды, бо спадзяваўся, што ён у чарговы раз можа паслужыць гаспадару. Сапраўды, чалавеку ў дрэва неабходна вучыцца жыццёвай мудрасці: проста жыць і з годнасцю сустракаць смерць: "Толькі як духам зусім сыду, / падпіліце мяне - / я да вашых ног, / можа, апошняй карысцю якой упаду". З вялікай цяжкасцю стасуюцца рамантычныя, гуманістычныя разважанні дрэва з практыцызмам чалавечага свету: "Але чую: зноў едзе Іван. / І не адзін, здаецца, - / Грымяць бензапілы...".

Дрэвы моцныя сваімі повязямі з вечнасцю, з зямлёю, захоўваюць памяць пакалення людзей, пры якіх яны раслі. М.Аляхновіч, аўтар верша "Карані", нагадвае: дрэву не выжыць без чыстага паветра, як і чалавеку - без каранёў, без адчування духоўных вытокаў. Таму паэт заклікае людзей быць літасцівымі, добразычлівымі да ліпаў, каштанаў, клёнаў, таполей:"чэзне, сохне задыханы ліст. / Трэба болей паветра ім, волі, / трэба птушак у іхнім галлі. Карані наталіце! Не згасла, / каб жыццё іх... ".

Дзіўнае ўражанне пакідае і верш Н.Гарагляд "У пушчанскіх вальерах". З аднаго боку, заўважаецца поўнае паразуменне паміж чалавекам і прыродай. Лірычны герой верша адчувае боль жывой істоты, што жыве ў няволі. З другога боку, паэтка паказвае пастаяннае паасобнае існаванне чалавека і прадстаўніка жывёльнага свету: "Праз дрот духмянай лусткай хлеба / Зубра частую і аленя. / А ім не хлеба - волі трэба / І росных траваў па калена".

Як бачна, паэты сваёй творчасцю сцвярджаюць: лёс прыроды залежыць ад чалавека, але і прырода ўплывае на характар чалавека, яго душэўны стан. Такім чынам, узаемаадносіны чалавека і прыроды - працэс двухбаковы. Ці не таму ў літаратуразнаўстве ў апошні час даволі распаўсюджанымі сталі такія паняцці, як экалогія душы, экалагічнае сумленне, экалагічная адказнасць...